- Я не ганю землі чужыя,
- Хай іх сонца не абміне!
- Толькі дзе б за морам ні быў я,
- Мая Глінка снілася мне…



# Прэзентацыя работы аб’яднання па інтарэсах

# “Наш край”



# Мая радзіма- вёска Глінка

- Наша малая радзіма – вёска Глінка (цяпер аграгарадок), што знаходзіцца ў Столінскім раёне Брэсцкай вобласці. Яна складаецца з розных частак – мікратапонімаў. Яны маюць свае назвы. Прапануем паглядзець на іх сучасны выгляд і даведацца пра іх гісторыю.

# Паходжанне вёскі Глінка

- Назва вёскі Глінка ўтварылася ад слова “гліна”. Вось што нам пра гэта гаворыць легенда.
- ...Даўным-даўно на месцы сучаснай вёскі былі непраходныя балоты. Сюды амаль ніхто з людзей і не заглядваў. Але аднойчы ехаў праз гэтую мясцовасць пан са сваімі парабкамі. І, вядома ж, ён не змог праехаць праз гэтыя балоты і таму застраў. Пакуль слугі выцягвалі яго карэту, пан паспеў заўважыць, што можна сюды прывезці людзей з некаторых вёсак і абжыць гэтую зямлю. Ён так і зрабіў. Людзі мала-памалу абжывалі гэтую тэрыторыю. Спачатку яны назвалі вёску, якая ўтварылася на месцы балот “Глінянае”, а потым перамянілі назву і сталі называць яе Глінка.

# Гісторыя ўзнікнення і развіцця сяла

- У мястэчку Гарынь жыў памешчык Вірэн. Ён дазволіў сваім прыгонным сялянам заняць неапрацаваную зямлю на тэрыторыі свайго маёнтка, дзе хто пажадае, папярэдне адпрацаваўшы паншчыну. Першы чалавек, які з’явіўся ў нашай мясцовасці, аблюбаваў больш высокае месца пад назвай “Старына”. Тут і была пабудавана першая хаціна. Гэта было тое месца, дзе праз сто гадоў пабудаваў хату жыхар в.Глінка Язубец Якаў Адамавіч. Цяпер тут жыве яго сын. Другія людзі аблюбавалі сабе месца далей на захад і назвалі яго “Перасёлы”. Тут яны пабудавалі сваё жыллё, усяго 17 хацін.
- Праз некаторы час з сялення Цмень на “Старыну” было перасялена 3 сям’і. Пасля гэтага “Старына” налічвала 15 хат. Усе хаты былі раскіданы сярод балота ў беспарадку. Неўзабаве паміж “Старынай” і “Перасёламі” была пракладзена грэбля (месца з бярвення і галля для праезду цераз балота). Праз грэблю людзі хадзілі з “Старыны” ў “Перасёлы”. “Старыны” цяпер няма, а “Перасёлы” існуюць да сённяшняга часу. Толькі цяпер гэтая частка стала ўрочышчам “Прысёла”. Грэблю паступова людзі асушылі і забудавалі хатамі.
- Вёска Глінка вядома з канца 18 ст. У 1795 годзе было 37 двароў , 253 жыхары.


ГЛІНКА

# Крыж – абярэг нашай вёскі (устаноўлены летам 2016 года)



# “Часткі Глінкі”

Аб’яднанне па інтарэсах “Наш край”

# Гэта знаходзіцца ў “Цэнтры”

















# “Цэнтр”

- Магчыма, гэтая назва ўтварылася ад самых важных пабудоў вёскі: дзяржаўныя крамы, школа, фельчарска - акушэрскі пункт, камбінат бытавога абслугоўвання, сельскі савет, сельская бібліятэка і Дом культуры, кафэ “Верасок”. Усе гэтыя пабудовы ўяўляюць “кола”.

  “Цэнтр” – таму што знаходзіцца паміж “Сялом” і “Смольняй”.

# Пачатак “Сяла”- вуліца Савецкая



# Славутасці “Сяла”- праўленне КСУП “АграГлінка”



# Нядзельная школа



# Царква Святой Вялікамучаніцы Параскевы Пятніцы



# Аддзяленне сувязі



# Самы “квітнеючы” дом “Сяла”



# Крама “Тапалёк”



# Абярэг “Сяла”- Крыж



# Чаму частка вёскі называецца “Сяло”?

- На месцы сучаснай Глінкі першапачаткова размяшчалася невялічкае сяло. Дзесьці каля царквы стаялі вароты, якія ў поўнач зачыняліся, а раніцай адчыняліся. За варотамі пасяляліся людзі. Праз некалькі год вароты разбурылі, але назва засталася да сённяшняга часу- “Сяло”.

# Пачатак “Астраўка”- часткі Глінкі



# “Астравок”

- Раней наша вёска была вельмі забалочанай. Месца, якое мы зараз называем “астравок”, узнімалася сярод балота, нібы востраў. Там спачатку людзі і пасяліліся. З-за таго, што гэтая мясцовасць аддзялялася ад іншай тэрыторыі , нібы востраў, яе і сталі так называць – “Астравок”.

# “Алешнік” - частка Глінкі



# “Алешнік”

- Побач з тэрыторыяй “Астраўка” знаходзілася нізкая мясціна, дзе не было хат. Старажылы нашай вёскі пасадзілі на гэтым месцы шмат алешын. Так і сталі называць гэтую частку вёскі – “Алешнік”.  Вакол яго цяпер пабудавана мноства хат.

# “Загата”- частка Глінкі



# “Загата”

- Даўным-даўно, калі наша мясцовасць была забалочанай, на тым месцы, якое мы зараз называем “Загатай”, балота пачало асушацца. Людзі заўважылі гэта і выкапалі вакол яго роў (загацілі). Туды сцякала вада. Хутка гэтае месца стала сухім. Там людзі на зіму зложвалі стагі сена. Ад слова “загаціць” і ўтварылася назва мікратапоніма – “Загата”.

# Пачатак “Смольні”-вуліца Савецкая



# Сельскі савет



# Крама “Мішутка ”



# ДУА “Глінкаўскі яслі-сад”








# Крама ў “Смольні”



# Канец “Смольні”(вул. Савецкая)



# Вул. Акцябрская (працяг “Смольні”)



# “Смольня”

- Назва гэтага мікратапоніма ўтварылася ад слова “смалярня”. Раней, вельмі даўно, у адным канцы вёскі Глінка стаяла смалярня, у якой расплаўлялі смалу. Праз некалькі год смалярня знікла, але назва засталася. І вось той канец вёскі Глінка, дзе стаяла смалярня, стаў называцца “Смольня”.

# Пачатак “Даліны”- часткі вёскі



# “Даліна” – частка вёскі



# “Даліна”

- Мясцовыя старажылы расказваюць, што  ў канцы 19 стагоддзя пачалі будаваць хаты ў баку ад забудаванай  часткі  вёскі. Вядома, што першую хату ў гэтай частцы пабудаваў  Вяроха  Адам Іванавіч , якая захавалася да гэтага часу. Яе гаспадар  загінуў  у гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэтыя адасобленыя хаты знаходзіліся далёка ад заселеных месцаў. Таму гэтую частку сталі называць і называюць да гэтага часу “Даліна”.

Дом на Акцябрскай (зроблены мясцовым майстрам- Ворахам Якавам Адамавічам)



# Частка Глінкі – “Санькаўка”



# “Санькаўка”

- Некалі вельмі даўно ў гэтай частцы вёскі пасяліўся першы чалавек, якога аднавяскоўцы празвалі “Санько”. Яго ўжо даўно няма, але памяць пра яго жыве і цяпер, таму што частку вёскі, дзе ён жыў, завуць людзі “Санькаўка”.

# “Міроў”- частка Глінкі (здалёк)



# Пачатак “Мірова”



# Сярэдзіна “Мірова”



# Дрэва- магутны дуб каля “Мірова”



# “Міроў”

- Міроў” - гэта “наводшыбе, вельмі далёка”, - так гаварылі і гавораць мясцовыя старажылы. Гэтая частка вёскі раней знаходзілася ў баку ад першых пасяленняў людзей. Цяпер ўсё забудавана і знаходзіцца разам з іншымі часткамі. Але да гэтага часу гэтую частку так і называюць – “Міроў”. “

# Выган



# “Выган”

- Даўным-даўно была толькі адна вуліца ў вёсцы. Яшчэ была вялікая колькасць балот, таму людзі жылі толькі на адным канцы сучаснай Глінкі. Калі прыходзіла пара выганяць кароў, коз, авечак, коней на пашу, то людзі выганялі іх за платы. Цяпер гэтая частка вёскі забудаваная, але яе называюць і сёння “Выган”.

- Над прэзентацыяй працавалі:
- удзельнікі аб’яднання па інтарэсах “Наш край”,
- кіраўнік : Ярашэвіч  Людміла Іванаўна;
- узроставы склад удзельнікаў  аб’яднання : 12-14 гадоў